**В номере:**

Что в бюджетной копилке?



с.5

НаШУМевший конфликт



с.8

Сервис у обочины



с.7

Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ

№52 (10870)

13 ліпеня 2019 года Субота

УРАДЖАЙ-2019



Кіраўнік гаспадаркі Алена Мажанава з камандай хлебаробаў

# ...І поўных бункераў

## "Зажынкі" ў Крупцы далі старт масаваму жніву ў раёне

**Сёлета права афіцыйнага адкрыцця сезона ўборкі хлеба скарысталі аграрыі сельгаспрадпрыемства "Крупец".**

На мехдвары гаспадаркі сабраліся кіраўніцтва сельгаспрадпрыемства, камбайнеры, прадстаўнікі ўладаў раёна, грамадскіх аб'яднанняў, прафсаюзныя лідары і арганізатары ідэалагічнай работы. Шчырымі песнямі натхнялі камбайнераў на добрую працу салісты ансамбля народнай песні "Сударушка" гарадскога Дома культуры "Меліяратар".

– Уборачная кампанія не бывае лёгкай. Нямала выпрабаванняў давядзецца пераадолець і сёлета. Вы – лепшыя з лепшых, на вас робіцца стаўка, – у віншаванні першы намеснік старшыні райвыканкама Яўген Ігнаценка звяртаўся не толькі да хлебаробаў "Крупца".

Ва ўборачную кампанію ўключыліся ўсе гаспадаркі раёна. Першае зерне паступае на зернетакі. Па стане на 12 ліпеня ўбрана 2240 гектараў плошчаў, ураджайнасць складае больш за 22 цэнтнера з гектара. Усяго ж у раёне плануецца абмалаціць каля 20 тысяч гектараў пасеваў зерневых.

**(Заканчэнне – на с.2)**

**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

**Читайте в следующем номере:**

Сад мечты 24-летнего добрушанина

## Весткі з месцаў

### Вікторыя землячкі

Цераxаўчанка Дар'я Себік стала сярэбраным прызёрам юнацкіх Балтыйскіх гульняў. Яны праходзілі ў пачатку ліпеня ў шведскім Карлстадзе. Наша зямлячка кінула кап'ё на 38 метраў 18 сантыметраў.

Гэта другі значны поспех юнай спартсменкі на працягу ліпеня. Некалькі дзён таму ў Брэсце на першынстве Беларусі па лёгкай атлетыцы сярод дзяўчат 2004-2005 гадоў нараджэння Дар'я стала чэмпіёнкай Беларусі.

**Леанід МІНІЧ**

### Дабро ад "Аўтаанёлаў"

У нядзелю ўдзельнікі добрушскага маладзёжнага руху "Аўтаанёлы" паедуць да выхаванцаў прытулку раённага сацыяльна-педагагічнага цэнтра.

– За тыдзень да паездкі абвясцілі аб старце дабрачыннай акцыі ў сацыяльных сетках, – расказала адна з яе арганізатараў Анастасія Гатальская. – Да збору дзіцячага адзення і абутку далучыліся шматлікія жыхары раёна і нават гамяльчане.

Новыя рэчы выдаткавалі прадпрымальнікі, якія працуюць на гарадскім рынку і ў памяшканні былога магазіна "Дзіцячы свет", канцылярскімі таварамі забяспечылі Раман Лук'янцаў і Алена Міхедава. Свой унёсак у фінансаванне мерапрыемства зрабілі калектывы аддзялення ДАІ, пажарнай часці №1, бюро па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры.

**Людміла НАЗАРАВА**

### Градус падзення

У раённай арганізацыі Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа прайшла тэматычная сустрэча. На прафілактычную гутарку прыйшлі 16 падлеткаў, удзельнікі працоўнага лагера пры СШ №1. Тэма для дыялога невыпадковая: 11 ліпеня адзначаўся Сусветны дзень барацьбы з алкагалізмам.

Кіраўнік арганізацыі Вольга Загараднюк расказала аб уплыве алкаголю і наркотыкаў на арганізм, адказала на шматлікія пытанні рабят. Падлеткі былі здзіўлены, што бяспечнай дозы алкаголю ўвогуле не існуе.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**

ISSN 2073-1000

**погода**

Долгота дня 16.41

Луна

14 июля – в Стрельце,

15, 16 – в Козероге



Первая четверть

**14 июля**

НОЧЬЮ +13...+15

ДНЕМ +20...+21

Облачно с прояснениями.

Небольшой дождь.

Ветер ю.-восточный 1-2 м/с.

**15 июля**

НОЧЬЮ +15...+16

ДНЕМ +21...+22

Облачно.

Небольшой дождь.

Ветер восточный 1-2 м/с.

# ...І поўных бункераў

(Заканчэнне. Пачатак на 1 с.)

Першымі ўражаннямі аб пачатку жніва падзялілася і галоўны аграном "Крупца" Наталля Білотас.



Спявае "Сударушка"

– Пакуль убралі пасевы азімага жыта. Ураджайнасць – не ніжэй за 25 цэнтнераў з гектара, – расказвае спецыяліст. – Спадзяёмся, лепшыя ўчасткі, не кранутыя спякотай, парадуюць большай аддачай.

Прагнозы аграном робіць неахвотна. Заўважае, рапс, на які ў Крупцы спадзяваліся ў гэтым годзе, ледзь не страцілі пасля нядаўняга ўрагану. Асноўныя надзеі – на працавітасць і сумленнасць камбайнераў. На палетках працуюць пяць экіпажаў. Тэхніка хоць і неновая, не падводзіць. Крупецкія хлебаробы добра паказалі сябе ў леташнім раённым спаборніцтве. Каравай з мукі мінулагодняга ўраджаю ўручылі лепшаму камбайнеру Аляксандру Казарыну. На яго рахунку было 840 тон зерня, усяго на 5 тон больш, чым у яго калегі Сяргея Цуканава.

Віншаванні, граматы і ўдзячнасці ад раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання "Белая Русь", БРСМ, раённага аб'яднання прафсаюзаў, райкама прафсаюза работнікаў АПК атрымалі механізатары "Крупца", якія сумленна папрацавалі пры вырошчванні хлеба. Амаль усе работы па дыскаванні глебы выканаў Васіль Сукалін. Пасяўная ў гаспадарцы трымалася на працавітасці Віктара Шустава. Мікалай Краўцоў быў адказны за хімпраполку пасеваў.

**Лічбы**

По стане на 12 ліпеня ўбрана 2240 гектараў, намалот складае больш за 22 цэнтнера з гектара. Усяго плануецца абмалаціць каля 20 тысяч гектараў пасеваў зерневых.



Падкінуць сноп – на шчасце

Сучасныя "зажынкі" ў многім адпавядаюць старажытным беларускім традыцыям. Упрыгожаны стужкамі першы сноп з адборных каласоў гаспадар па традыцыі ставіў у чырвоны кут. Старшыні сельгаспрадпрыемства Алене Мажанавай, якая, па словах працаўнікоў гаспадаркі, душу ўклала ў вырошчванне свайго першага ўраджаю, сноп уручыла палявод з 20-гадовым стажам Алена Краўцова.

– У мінулым годзе, калі я ўзначаліла гаспадарку, мы карысталіся вынікам працы папярэднікаў. Сёлетні ўраджай для мяне – першы. Мэтанакіраванасць і ваша працавітасць, упэўнена, прынясуць добры вынік, – адзначыла Алена Мажанава.

Падкінуты на шчасце першы сноп, на добры плён асвечаны камбайны. Жніво стартавала.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**



Падзяка ад раённага аб'яднання прафсаюзаў



Бласлаўленне ад святара Віталія

**НА СВЯЗИ**

**15 июля**
**с 10.00 до 12.00**
**по телефону 7-12-70**
пройдет прямая телефонная линия с участием Тамары Евгеньевны БОРСЯКОВОЙ, начальника районной ветеринарной станции.

**В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ**

## Гарантия мира и созидания

**Президент Беларуси Александр Лукашенко подчеркивает важность мира и спокойствия на белорусской земле в эпоху глобальной военной нестабильности. Об этом он заявил на церемонии чествования выпускников военных учебных заведений и высшего офицерского состава.**

Президент подчеркнул, что профессионализм офицеров, их высокие моральные качества и стремление защищать свою землю являются гарантией мирной и созидательной жизни белорусского государства. «Именно вам, офицерам Вооруженных Сил, предстоит совершенствовать их современный облик, внедрять в боевую учебу все самое передовое, осваивать новейшие образцы техники и вооружения, учить войска действиям в соответствии с современными тенденциями военного дела, – сказал он».

**По материалам БелТА**

**КАНИКУЛЫ**

# Никаких смартфонов!

**– Сдаем мобильные телефоны, – с этой фразы начинается каждое утро в спортивном лагере детско-юношеской спортивной школы.**

Ежедневно, включая субботу, сюда приходят почти четыре десятка мальчишек и девчонок. Экскурсии, игры на свежем воздухе, конкурсы и викторины. В спортивных лагерях, которые в эти дни открыты в ДЮСШ и физкультурно-спортивном центре детей и молодежи, подготовлен исключительно активный отдых. За три недели запланировано несколько выездных экскурсий – в музеи, цирк, развлекательный центр...

– Основная часть детей – наши самые юные спортсмены. Но у некоторых есть первые победы. Они уже привыкли и к спортивному режиму, и к нагрузкам. Хотя для некоторых даже утренняя гимнастика поначалу была непривычной, – рассказывает тренер ДЮСШ Вера Михальцова.

**ЦИФРА**

В отделе образования, спорта и туризма райисполкома отмечают: в июле школы примут более 250 ребят. Летние лагеря труда и отдыха организованы в спортивных учреждениях, в школах в Корме, Жгуни, Крупце, в районном центре дополнительного образования. Всего же в летний период на оздоровление учреждения образования района примут 980 ребят.

Собеседница отмечает, как только дети лишились гаджетов, все внимание – на активные игры. Вот, разделившись на пары, дети выстраиваются перед телевизором. Со стороны действо, предложенное игровой приставкой, кажется необычным. Как будто девочки энергично танцуют. Например, чтобы преодолеть появляющуюся на экране водную преграду, нужно высоко прыгнуть, а после – резко пригнуться, уклоняясь от другого препятствия.



– Для спортсменов занятия в лагере – каникулы. Ежедневная тренировка хотя и обязательна, скорее, для поддержания формы, – отмечает Вера Михальцова.

**Татьяна АХРАМЕНКО**
**Фото Евгения УСТИНОВА**